# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 930:[39:069](476.1)

*К. А. Скур'ят*

## Этнаграфічная спадчына Міншчыны ў беларускай гістарыяграфіі

*Аналізуюцца крыніцы па даследаванні этнаграфіі Міншчыны, зборы, захаванні і прэзентацыі этнаграфічных калекцый у музеях Мінскай вобласці. Разглядаюцца этапы вывучэння этнаграфічнай спадчыны з пачатку XIX да пачатку XXI ст. Падкрэсліваецца ўклад вучоных Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі, Інбелкульта, інстытутаў гісторыі, мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, краязнаўчых музеяў і іншых у выяўленне і збіранне этнаграфічных матэрыялаў.*

*Сярод навуковых даследаванняў, прысвечаных вывучэнню этнаграфічнай спадчыны, аўтар вылучыў такія групы, як традыцыйная культура Беларусі, гісторыя функцыянавання этнаграфічных калекцый музеяў на тэрыторыі Мінскай вобласці.*

***Ключавыя словы:*** *этнаграфія, этнаграфічныя крыніцы, гістарыяграфія, Мінская вобласць, этнаграфічныя калекцыі.*

*K. Skuryat*

## Ethnographic heritage of Minsk Region in Belarusian historiography

*The article analyzes the sources for the study of the ethnography of the Minsk Region, the collection, preservation and presentation of ethnographic collections in the museums of the Minsk Region, and examines the stages of studying the ethnographic heritage since the beginning of the 19th century. to the beginning of the 21st century, the contribution of the scientists of the Society of Lovers of Natural Science, Anthropology and Ethnography, Inbelkult, Institutes of History, Art, Ethnography and Folklore of the Academy of Sciences of the BSSR, the Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus, local history museums and others to the identification and collection of ethnographic materials. Among scientific studies devoted to the study of ethnographic heritage, the author singled out such groups as the traditional culture of Belarus, the history of the functioning of ethnographic museum collections in the territory of the Minsk region.*

***Key words:*** *ethnography, ethnographic sources, historiography, Minsk region, ethnographic collections.*

Сёння вывучэнне гістарычнай спадчыны краіны з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў даследаванняў навукоўцаў і дзейнасці музейных устаноў. Калекцыі этнаграфічнай спадчыны захоўваюцца ў асноўным у комплексных краязнаўчых музеях Беларусі, якія з'яўляюцца цэнтрамі прэзентацыі беларускай гісторыі і культуры. На 2023 год у Мінскай вобласці дзейнічаюць 23 рэгіянальныя музеі, без уліку прыватнаўласніцкіх. Багатыя этнаграфічныя калекцыі змешчаны ў Гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе», Капыльскім раённым краязнаўчым музеі, Музеі гісторыі Клетчыны, Івянецкім музеі традыцыйнай культуры, Старадарожскім гісторыка-этнаграфічным музеі, Уздзенскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі, Слуцкім краязнаўчым музеі, Мінскім абласным краязнаўчым музеі ў г. Маладзечна і інш.

*Мэта работы* – прааналізаваць літаратурныя крыніцы па вывучэнні этнаграфічнай спадчыны, яе захаванні і экспанаванні ў музеях Мінскай вобласці.

Каб акрэсліць стан акадэмічнай этнаграфічнай навукі разгледзім вылучаныя аўтарам групы даследаванняў.

Да першай групы аднесены работы, прысвечаныя вывучэнню традыцыйнай культуры Беларусі і Міншчыны. Звесткі аб этнаграфіі беларусаў зафіксаваны ў старажытных летапісных крыніцах («Аповесць мінулых гадоў» і інш.), хроніках XVI–XVIII стст. («Баркулабаўскі летапіс», «Хроніка Быхаўца» і інш.) [27].

Грунтоўнае даследаванне народнай культуры мясцовага насельніцтва распачата ў 1-й палавіне XIX ст. Беларусь вывучалі дзеячы беларускай і польскай культуры (Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, У. Сыракомля, І. І. Шыдлоўскі, І. Я. Храпавіцкі, А. Ф. Рыпінскі, М. І. Балінскі, Р. С. Зянькевіч і інш.), расійскія навукоўцы (І. І. Ляпёхін, В. М. Севяргін) [Там жа, с. 11].

Адной з першых грунтоўных прац па краязнаўстве Міншчыны з'яўляецца «Апісанне Барысаўскага павета» (1847) Я. П. Тышкевіча. З дапамогай краязнаўцаў К. Адамовіча, Я. Ваньковіча, К. Тышыньскага і іншых даследчыкаў Я. П. Тышкевіч зрабіў комплекснае апісанне Барысава і Барысаўскага павета [10, с. 51]. У кнізе адлюстравана шырокая палітра краязнаўчых звестак пра побыт гараджан, сялянскае жыццё, будаўніцтва, народны фальклор, прыведзены змястоўны збор гістарычных мясцовых паданняў, прымхаў і забабонаў.

Кніга П. М. Шпілеўскага «Путешествие по Полесью и белорусскому краю», надрукаваная ў 1853–1855 гг. у часопісе «Современник», змяшчала каштоўныя даныя па гісторыі, культуры і побыце беларусаў Мінскай губерні. У нарысах П. М. Шпілеўскага знайшлі адлюстраванне асаблівасці беларускай мовы, абрадаў, фальклору, маляўнічыя апісанні беларускіх гарадоў, вёсак, мястэчак, запісы легенд і паданняў. Самабытнасць бе-

ларускага народа падкрэслена ў апавяданнях пра Койданава, Стоўбцы, Заслаўе, Смалявічы, Ігумен [Там жа, с. 68].

Больш сістэматычнае і мэтанакіраванае збіранне этнаграфічнага матэрыялу пачалося пасля заснавання Рускага геаграфічнага таварыства (1845) і Паўночна-заходняга аддзялення РГТ (1867), адчыненага ў Вільні. Этнаграфічны зборнік (выдаваўся РГТ) апублікаваў працу выдатнага даследчыка А. Г. Кіркора «Этнографический взгляд на Виленскую губернию» (1858), у якой апісаны быт, традыцыі, абрады, насельніцтва Віленскай губерні [Там жа, с. 60]. Паводле Рускага біяграфічнага слоўніка А. А. Полаўцава, нарыс А. Г. Кіркора доўгі час з'яўляўся лепшым этнаграфічным даследаваннем [11, с. 670].

Матэрыялы, сабраныя ў 1840–1850-я гг. А. Г. Кіркорам, склалі частку трэцяга тома выдання «Живописная Россия...» (раздзелы «Літоўскае Палессе» і «Беларускае Палессе», дзе разглядаюцца гісторыя краю, матэрыяльная культура, традыцыйная гаспадарка, народная творчасць, быт мясцовых жыхароў. Міншчына ўваходзіла ў склад Беларускага Палесся і ёй нададзена нямала месца ў працы [12].

Па заданні Генштаба Расійскай арміі з ваенна-стратэгічнымі мэтамі было праведзена вывучэнне беларускіх зямель. Сабраныя гістарычна-статыстычныя звесткі з апісаннем губерняў, у тым ліку Мінскай, друкаваліся ў «Материалах…»[1]. Зборам этнаграфічных матэрыялаў займаліся афіцэры, ураджэнцы заходніх губерняў. І. І. Зяленскі з'яўляецца аўтарам-укладальнікам дзвюх частак «Матэрыялаў…», прысвечаных Міншчыне, дзе падрабязна разглядаюцца гісторыя губерні, этнаграфічная культура народаў, якія пражывалі на яе тэрыторыі, пытанні адукацыі і рэлігіі, шляхі ўзнікнення гарадоў, адлюстраваны асаблівасці будаўніцтва і побыту беларусаў.

Важную ролю ў актывізацыі вывучэння Міншчыны адыгралі Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі, створанае ў 1864 г. пры Маскоўскім універсітэце, і Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства. У 1860–1870-х гг. з'явіліся працы аб матэрыяльнай культуры і вытворчай дзейнасці народа І. І. Насовіча [19], М. А. Дзмітрыева, І. А. Бермана, К. П. Тышкевіча і інш.

Энцыклапедыяй народнага жыцця з'яўляецца «Белорусский сборник» (1886–1912) Е. Р. Раманава [21]. У канцы XIX ст. былі падрыхтаваны фальклорна-этнаграфічны зборнік П. В. Шэйна («Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края») [26], апісанні матэрыяльнай і духоўнай культуры М. В. Доўнар-Запольскага, У. М. Дабравольскага, А. Я. Багдановіча, А. С. Дамбавецкага і інш.

---

[1] Минская губерния / сост. И. Зеленский // Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. – СПб., 1864. – Т. 2, ч. 1. – 672 с. – Ч. 2. – 721 с.

Пасля 1917 г. пачаўся новы этап этнаграфічнага вывучэння Міншчыны. Этнографы ўдзельнічалі ў нацыянальным раянаванні і вызначэнні дзяржаўных меж краіны. У створаным у Маскве Беларускім народным універсітэце (1918) Д. Н. Анучын, М. А. Янчук і У. І. Пічэта чыталі лекцыі па этнаграфіі і гісторыі Беларусі. Я. Ф. Карскі, У. М. Дабравольскі, М. А. Янчук, А. К. Сержпутоўскі актыўна ўключыліся ў арганізацыю этнаграфічных цэнтраў. У Інстытуце беларускай культуры (1922) было створана Цэнтральнае бюро краязнаўства (1924), кафедра этнаграфіі (1927), вялася актыўная экспедыцыйная праца. Выйшлі 3-томнае фундаментальнае даследаванне «Беларусы» (1921) Я. Ф. Карскага [9], працы А. К. Сержпутоўскага, І. А. Сербава, А. А. Шлюбскага, Н. І. Лебедзевай, прысвечаныя пытанням этнічнай гісторыі, асаблівасцям матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

Моцным імпульсам для ўздыму айчыннай этнаграфіі ў 1920-х гг. стала дзяржаўная палітыка беларусізацыі і масавы краязнаўчы рух, які разгарнуўся па ўсёй краіне. У 1924 г. было створана Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК). Яно каардынавала дзейнасць мясцовых краязнаўчых арганізацый, а з 1925 г. наладзіла выпуск часопіса «Наш край». У часопісе друкаваліся інструкцыі, анкеты, апытальнікі і іншыя метадалагічныя матэрыялы, распрацаваныя вядучымі спецыялістамі (этнографамі, фалькларыстамі, археолагамі і інш.), што дазволіла ўзняць краязнаўчыя даследаванні на высокі навуковы ўзровень, а таксама каштоўныя ў навуковым плане карэспандэнцыі з рэгіёнаў. Плён фалькпорна-этнаграфічнага пошуку краязнаўцаў Беларусі быў больш чым унушальны. Яны сабралі 150 тыс. картак-слоў, больш за 30 тыс. узораў фальклору, каля 200 розных калекцый. Усяго ў Акадэміі навук БССР (утворана на базе Інбелкульта ў 1929 г.) захоўвалася каля 70 тыс. адзінак этнаграфічных апісанняў і фальклорных тэкстаў, да 10 тыс. фотаздымкаў і 2 тыс. этнаграфічных экспанатаў.

Практычна ўсе назапашаныя ў даваенныя гады этнаграфічныя матэрыялы былі знішчаны ў перыяд акупацыі 1941–1944 г. (загінула больш за 70 тыс. адзінак этнаграфічных апісанняў і фальклорных тэкстаў), разрабавана фотатэка, картатэка АН БССР, музейныя фонды) [5].

Вывучэнне этнаграфіі Беларусі, у т. л. Міншчыны, было ўзноўлена пасля вайны сектарам этнаграфіі і фальклору пры Інстытуце гісторыі АН БССР. У гэты час разгарнулася экспедыцыйная і навукова-даследчая праца. Пасля стварэння ў 1957 г. Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР навуковымі даследаваннямі былі ахоплены амаль усе аспекты беларускай этнаграфіі: паходжанне і этнічная гісторыя беларусаў (М. Я. Грынблат), матэрыяльная культура, народнае жыллё і промыслы (Л. А. Малчанава, Э. Р. Сабаленка, І. М. Браім, В. С. Цітоў і інш.), некаторыя асаблівасці побыту рабочых (В. М. Іваноў), побыт сялян ва ўмовах гітлераўскай акупацыі (А. І. Залескі), народная абрад-

насць, гаспадарчы і жыццёвы вопыт (М. М. Нікольскі, А. А. Мялешка, Л. І. Мінько, Р. В. Надольскі і інш.), этнакультурныя працэсы ў горадзе і вёсцы (В. К. Бандарчык, І. М. Браім, Э. Р. Сабаленка і інш.).

Народнае дойлідства дзякуючы этнаграфічным, археалагічным і гістарычным матэрыялам найбольш вывучана даследчыкамі. Былі выяўлены шматлікія помнікі народнай архітэктуры. Навукоўцы сістэматызавалі планіровачныя рысы сядзіб, даследавалі генезіс пагоннага і вяночнага двара, жылых канструкцый, вызначылі кола фактараў, якія паўплывалі на іх фарміраванне і распаўсюджанасць у рэгіёнах Беларусі. Для прац, выкананых у другой палове XX ст., характэрны разгляд асобных кампанентаў традыцыйнай культуры беларусаў XIX – пач. XX ст. Асаблівасці паселішчаў, сядзіб, жылля, інтэр’ера і архітэктурнага дэкору Міншчыны разглядаюцца ў працы А. І. Лакоткі «Белорусское народное зодчество. Середина XIX–XX вв.» [13].

Сабраныя багатыя матэрыялы аб земляробстве, жывелагадоўлі, промыслах і рамёствах Міншчыны дазволілі даследчыкам вызначыць традыцыйныя гаспадарчыя заняткі беларусаў у дарэвалюцыйны час, іх змяненне з прыходам савецкай улады (асаблівая ўвага надавалася вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі).

Першым фундаментальным выданнем па праблеме распаўсюджаных у Беларусі традыцыйных прылад працы стала кніга «Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў» [18], у якой змешчаны публікацыі Л. А. Малчанавай, М. Я. Грынблата.

Н. І. Буракоўская, Я. М. Сахута [22], Л. А. Малчанава, В. С. Цітоў, У. С. Гуркоў, І. М. Браім і інш. прааналізавалі і сістэматызавалі матэрыялы аб промыслах і рамёствах Міншчыны, іх развіцці і рэгіянальнай спецыфіцы, апісалі традыцыйныя прылады працы і спосабы іх выкарыстання.

Вялікі ўклад у вывучэнне краю зрабілі краязнаўчыя музеі, асабліва Мінскі абласны краязнаўчы музей, які быў адкрыты ў 1959 г. Супрацоўнікамі музея праводзілася экспедыцыйная і навукова-даследчая праца. У выніку экспедыцый была атрымана вялікая колькасць каштоўных прадметаў этнаграфічнага характару (традыцыйныя вышыўкі, бондарства, саломапляценне, элементы адзення, народныя касцюмы і інш.).

Такім чынам, у савецкія часы айчыннымі навукоўцамі была прааналізавана багацейшая этнаграфічная спадчына папярэднікаў, прааналізаваны амаль усе бакі традыцыйнай культуры, даследавана ўся тэрыторыя рэспублікі, назапашаны каштоўны палявы матэрыял.

Сёння існуе дастатковая колькасць навуковай, навукова-папулярнай, публіцыстычнай літаратуры, прысвечанай аб’ектам этнаграфічнай спадчыны Мінскай вобласці.

У працах А. К. Кіркора [12], П. В. Шэйна [26], Т. А. Навагродскага [17], В. С. Цітова, І. П. Корзуна, Л. А. Малчанавай [1] даследаваны традыцыі харчавання Міншчыны. Аўтарамі выкарыстаны сучасны тэарэтычны падыход да аналізу традыцыйнай культуры харчавання беларусаў, вылучаны структурныя элементы, прапанавана іх класіфікацыя як часткі матэрыяльнай культуры.

Асаблівасці народнага мужчынскага і жаночага касцюма розных слаёў грамадства Міншчыны разгледжаны ў працах В. М. Бялявінай, Л. В. Ракавай, Л. А. Малчанавай, М. Ф. Раманюка, Л. І. Маленка і інш. [1; 20].

Адной з важных галін народнай вытворчай дзейнасці беларусаў з'яўляюцца промыслы і рамёствы, даследаваннем якіх займаюцца В. С. Цітоў, А. М. Курыловіч, Н. І. Буракоўская, С. Ф. Цярохін і інш. Варта адзначыць, што першы том 8-томнага выдання «Беларусы» пад назвай «Прамысловыя і рамесныя заняткі» адлюстроўвае характар і асаблівасці здабыўных промыслаў і рамёстваў [2].

Сабраныя беларускімі этнографамі і фальклярыстамі матэрыялы пра аграрна-каляндарную абраднасць адлюстраваны ў калектыўнай манаграфіі «Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі» [4]. Навукоўцамі разглядаюцца не толькі этнаграфічныя артэфакты мінулага, але і сучасныя з'явы культуры Міншчыны. Такія віды мясцовай традыцыйнай культуры, як каляндарныя і сямейныя звычаі, песенны і інструментальны фальклор Мінскай вобласці, былі прааналізаваны ў пятым томе «Традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў» (2 часткі). Праца была выпушчана пасля трохгадовага комплекснага даследавання культуры Цэнтральнай Беларусі, праведзенага супрацоўнікамі лабараторыі традыцыйнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры з удзелам даследчыкаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі [24].

Лакальна-тыпалагічныя асаблівасці Міншчыны разгледжаны В. С. Цітовым. Вялікую навуковую каштоўнасць мае даследаванне А. І. Лакоткі «Историко-культурные ландшафты Беларуси», у якім раскрыты тэарэтычныя аспекты гісторыка-культурнага раянавання Беларусі, закрануты пытанні рэпрэзентацый культурнай спадчыны [14].

Этнаграфічная і рэгіянальна-лакальная асаблівасць Міншчыны была даследавана ў калектыўнай манаграфіі «Этнокультурные процессы Центральной Беларуси в прошлом и настоящем» [28]. Стварэнню дадзенай манаграфіі папярэднічалі этналагічныя даследаванні супрацоўнікаў аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, праведзеныя ў 2011–2015 гг. Праца дае комплекснае ўяўленне аб этнакультурных традыцыях, ранняй этнічнай і этнаканфесійнай гісторыі, асаблівасцях традыцыйнай культуры насельніцтва цэнтральнага рэгіёна Беларусі.

Да другой групы адносяцца крыніцы па вывучэнні гісторыі функцыянавання этнаграфічных музеяў на тэрыторыі Мінскай вобласці. Гэта, напрыклад, працы А. А. Гужалоўскага [5–7], І. М. Сімаковай [23] і інш. Пачатак развіцця этнаграфічных музеяў у XVIII–XIX стст. на тэрыторыі Беларусі разгледжаны ў артыкулах І. М. Сімаковай, І. В. Грабянчука, у працы А. А. Гужалоўскага «Нараджэнне беларускага музея» [8].

Фарміраванне этнаграфічных калекцый музеяў Мінскай вобласці ў XX–XXI стст. апісваецца ў працах А. А. Гужалоўскага – «Музеі Беларусі (1918–1941 гг.)», «Музеі Беларусі (1941–1991 гг.)», артыкулах І. М. Сімаковай і інш. [6; 7; 23].

Даследаваннем функцыянавання беларускіх этнаграфічных музеяў у сучасных умовах займаюцца Г. А. Ткацэвіч, А. М. Калбаска і інш.

Грунтоўная інфармацыя па гісторыі, традыцыях і калекцыях музеяў Мінскай вобласці змешчана ў кнізе «Музеі Беларусі» [16]. Гісторыю паступленняў у фонды музеяў можна знайсці ў асабістых дакументах музея (кнігі паступленняў, акты паступленняў, апісанні прадметаў).

У 2014 г. з мэтай папулярызацыі нацыянальнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь створаны праект «Музеі Беларусі» з «Белкарт», – гэта віртуальныя экскурсіі па музеях нашай краіны вачыма фотарэпарцёраў (170 музеяў і іх філіялаў). Менавіта недастатковае асвятленне і ўвага да музейнай тэматыкі ў СМІ Беларусі паслужыла галоўным матывам для запуску праекта. Задачай праекта арганізатары назвалі неабходнасць звярнуць увагу грамадскасці на культурную, гістарычную, этнаграфічную спадчыну Беларусі, павысіць цікавасць беларусаў да музеяў. Асаблівая ўвага ў артыкулах журналістаў надавалася рэгіянальным, у тым ліку этнаграфічным, музеям. Аўтары звярталіся не толькі да апісання калекцый і існуючай экспазіцыі, але і ацэньвалі апошнюю з пункту гледжання адпаведнасці сучасным тэндэнцыям.

У рамках праекта апублікавана 77 грунтоўных фоторэпартажаў, прысвечаных музеям Мінскай вобласці, значная колькасць якіх засяроджвае ўвагу на зборах і дзейнасці музеяў у рэгіёнах.

У 2018 г. выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі» была выпушчана кніга «Музеи Беларуси...». Кожны раздзел энцыклапедыі прысвечаны музеям асобнай вобласці Рэспублікі Беларусь. У артыкулах расказваецца гісторыя стварэння музеяў, прыводзяцца звесткі аб фондах і экспазіцыях, звяртаецца ўвага на найбольш цікавыя экспанаты, даецца кантактная інфармацыя [15].

Сайт museum.by знаёміць з каталогамі музеяў Мінскай вобласці, дадзены спасылкі на асабістыя старонкі музеяў, на якіх змешчана інфармацыя аб колькасці прадметаў у фондах, калекцыях, экспазіцыях музеяў, унікальных экспанатах, выставах і кантактныя даныя ўстановы.

Крыніцамі па рэпрэзентацыі этнаграфічных калекцый музеямі Мінскай вобласці сталі артыкулы ў друкаваных выданнях («Беларускі

музей», «Беларускі гістарычны часопіс», «Звязда», раённыя газеты) і інтэрнэт-парталах (museum.by, ethno.by і г. д.), статыстыка наведванняў музеяў, водгукі наведвальнікаў музеяў.

У актах прыёму, навуковых пашпартах, кнігах асноўнага і навукова-дапаможнага фонду музеяў захоўваюцца даныя па колькасці прадметаў, іх статусе, даце набыцця.

Пытанні папулярызацыі этнаграфічнай спадчыны разглядаюцца ў артыкулах В. Л. Блішч, А. І. Лакоткі і інш. [27]. У дысертацыйным даследаванні В. Л. Блішч прапанавала аўтарскае вызначэнне этнаграфічнай спадчыны, вылучыла некалькі тыпаў лакальных турыстычна-этнаграфічных тэрыторый Беларусі. Этнаграфічную спадчыну даследчыца тлумачыць як сукупнасць этнаграфічных артэфактаў, прызнаных этнічнай супольнасцю ў якасці важных і рэпрэзентатыўных для яе культурнай своеасаблівасці [3].

Сучаснае выкарыстанне этнаграфічнай спадчыны ў галіне турызму, у тым ліку музейнымі сродкамі, разгледжана ў калектыўнай працы «Туристическая мозаика Беларуси» (аўтары: А. І. Лакотка, В. М. Князева, Я. В. Марозаў, В. В. Ізотава) [25].

Такім чынам, на сённяшні дзень існуе дастатковая колькасць навуковай, навукова-папулярнай, публіцыстычнай літаратуры па вывучэнні этнаграфіі Мінскай вобласці і функцыянаванні этнаграфічных калекцый музеяў Міншчыны.

Этнаграфія Міншчыны актыўна вывучалася навукоўцамі пачынаючы з сярэдзіны XIX ст. У наш час навуковыя даследаванні вядуцца на высокім акадэмічным узроўні па розных напрамках традыцыйнай культуры. Крыніцазнаўчая база па функцыянаванні этнаграфічных калекцый музея на тэрыторыі Мінскай вобласці ўключае даследаванні беларускіх і замежных навукоўцаў, матэрыялы навуковых выданняў і канферэнцый, даныя Беларускага статыстычнага камітэта, а таксама архіўныя дакументы музеяў Мінскай вобласці.

*1.* Беларускае народнае адзенне / Л. А. Малчанава [і інш.] ; рэд. В. К. Бандарчык ; Акадэмія навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 136 с.

*2.* Беларусы : у 8 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995–2005. – Т. 1 : Прамысловыя і рамесныя заняткі / рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – 1995. – 351 с.

*3. Блищ, В. Л.* Этнографическое наследие белорусов в агроэкотуризме : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.07 / В. Л. Блищ ; Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси. – Минск, 2012. – 22 с.

*4.* Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык [і інш.]; пад рэд. В. К. Бандарчыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с.

*5. Гужаловский, А. А.* Белорусские музеи в период Великой Отечественной войны / А. А. Гужаловский // Вопр. музеологии. – 2018. – Т. 9, вып. 1. – С. 27–38.

*6. Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А. А. Гужалоўскі ; навук. рэд. У. М. Міхнюк. – Мінск : Нац. арх. Рэсп. Беларусь, 2002. – 176 с.

*7. Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1941–1991 гг.) / А. А. Гужалоўскі ; навук. рэд. У. М. Міхнюк. – Мінск : Нац. арх. Рэсп. Беларусь, 2004. – 192 с.

*8. Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : Нац. арх. Рэсп. Беларусь, 2001. – 124 с.

*9. Карскі, Я. Ф.* Беларусы / Я. Ф. Карскі ; уклад. і камент. С. Гараніна, Л. Ляўшун ; навук. рэд. А. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – 637 с.

*10. Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. А. Каханоўскі ; навук. рэд. Л. Д. Побаль. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

*11.* Киркор Адам-Гонорий Карлович // Рус. биографический сл. : в 25 т. / изд. под наблюдением пред. Имп. рус. ист. о-ва А. А. Половцова. – СПб., 1897. – Т. 8. – С. 669–670.

*12. Киркор, А. К.* Литовское Полесье. Белорусское Полесье / А. К. Киркор // Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении : в 12 т. / под ред. П. П. Семенова. – СПб. ; М., 1882. Т. 3 : в 2 ч. – С. 4–218, 235–428.

*13. Локотко, А. И.* Белорусское народное зодчество. Середина XIX–XX в. / А. И. Локотко. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 287 с.

*14. Локотко, А. И.* Историко-культурные ландшафты Беларуси / А. И. Локотко ; НАН Беларуси, Ин-т этнографии и фольклора. – Минск : Белорус. наука, 2006. – 470 с.

*15.* Музеи Беларуси = Музеі Беларусі = Museums of Belarus : фотоальбом / ред. совет: В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. энцыкл., 2018. – 447 с. : ил.

*16.* Музеі Беларусі / рэд. савет: Г. П. Пашкоў, Л. В. Календа, М. Г. Нікіцін. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2008. – 559 с. : іл.

*17. Навагродскі, Т. А.* Традыцыі народнага харчавання беларусаў / Т. А. Навагродскі. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2000. – 112 с.

*18.* Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў / Л. І. Мінько [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 103 с.

*19. Носович, И. И.* Словарь белорусского наречия / сост. И. И. Носович. – СПб. : Отд-ние рус. яз. и словесности Акад. наук, 1870. – 756 с.

*20. Раманюк, М. Ф.* Беларускае народнае адзенне : альбом / М. Ф. Раманюк. – Мінск : Беларусь, 1981. – 47 с. : іл.

*21. Романов, Е. Р.* Белорусский сборник : в 9 вып. / Е. Р. Романов. – Киев : Тип. С. В. Кульженко, 1885–1912. – Вып. 8–9 : Быт белоруса. Словарь. – 730 с.

*22. Сахута, Я. М.* Беларуская народная кераміка / Я. М. Сахута. – Мінск : Полымя, 1987. – 112 с. : іл.

*23. Сімакова, І. М.* Камплектаванне фондаў дзяржаўных этнаграфічных музеяў Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI ст. / І. М. Сімакова // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны : навук. зб. / рэдкал.: С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – Вып. 7. – С. 157–164.

*24.* Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / В. І. Басько [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2011. – Т. 5 : Цэнтральная Беларусь : у 2 кн. – Кн. 1. – 847 с. : ил.

*25.* Туристическая мозаика Беларуси / А. И. Локотко [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 640 с.

*26. Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северозападного края / собранные и приведенные в порядок П. В. Шейном : в 3 т. – СПб., 1887–1902. – 3 т.

*27.* Этнаграфія Беларусі : энцыкл. / рэдкал.: П. І. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.

*28.* Этнокультурные процессы Центральной Беларуси в прошлом и настоящем / А. В. Гурко [и др.]; науч. ред. А. В. Гурко ; Нац. акад. наук Беларуси, Центр исслед. белорус. культуры, языка и лит., Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Минск : Беларус. навука, 2016. – 539 с.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 23.02.2023.